# Водна-балотны квэст, ці Якое дачыненне да балот мела Бона Сфорца?

Амаль 45 гадоў увесь свет 2 лютага адзначае дзень водна-балотных угоддзяў. У 1971 годзе ў іранскім горадзе Рамсар падпісалі Канвенцыю аб водна-балотных угоддзях. Яны сталі другім домам і асяроддзем пражывання для вадаплаўных птушак. У спісе з 2186 тэрыторый ёсць і 16 беларускіх, сярод якіх заказнікі "Спораўскі", "Званец", "Альманскія балоты". Але што мы пра іх ведаем? У рамках праекта ПРААН/ГЭФ "Кіраванне тарфянікамі на аснове ландшафтных падыходаў з мэтай атрымання шматбаковых экалагічных выгад", а таксама пры падтрымцы Мінпрыроды і грамадскай арганізацыі "Чыстая вада" ў пасёлку Дружны Пухавіцкага раёна адбыўся водна-балотны квэст, у якім удзельнічалі самыя цікаўныя прыродазнайкі ДУА "Сярэдняя школа №1". А як гэта было — чытайце далей.

Вядома ж, перад "спаборніцтвам" варта падрыхтавацца — у нашым выпадку, паўтарыць тэорыю. Дапамагла з гэтым кіраўнік аддзела зямель і ландшафтаў Мінпрыроды Таццяна Трафімовіч. Яна нагадала дзецям пра тое, што водна-балотныя ўгодзі кормяць чалавецтва — на іх вырошчваюць рыс. Яны робяць палёгку людзям — паглынаюць вуглякіслы газ і тым самым аддаляюць развіццё парніковага эфекту. А што ўжо казаць пра насельнікаў балот, рачных етотаў, частак марскіх узбярэжжаў — рэдкіх птушак? У Беларусі, дарэчы, прапісаліся такія віды, як вяртлявая чаротаўка і вялікі падорлік.

Каардынатары грамадскай арганізацыі "Чыстая вада" Канстанцін Чыкалаў і Вольга Каскевіч паказалі дзецям дакументальную стужку "Подых балот", у якой вядзецца аповед пра асушаныя "лёгкія Еўропы" на беларускіх землях — балоты Дакудаўскае, Морачна. Некалькі слоў дадаў і кіраўнік праекта "Тарфянішчы-2" Аляксей Арцюшэўскі:

- Глабальны экалагічны фонд выдаткаваў 3 мільёны долараў на падрыхтоўку Нацыянальнай стратэгіі кіравання тарфянікамі і балотамі. Пілотныя праекты накіраваны на аднаўленне асушаных тарфянікаў метадам паўторнага забалочвання. Акрамя таго, праект мае і адукацыйны складнік, у рамках якога праводзіцца і сённяшняе мерапрыемства.

І вось нарэшце пачалася самая рухомая частка святкаванняў — уласна балотны квэст. Школьнікі падзяліліся на чатыры каманды па пяць чалавек і атрымалі канверты з заданнямі. У кожнай групы быў свой памагаты валанцер, які тлумачыў незразумелыя пытанні.

Мы рушылі па маршруце разам з камандай пад кіраўніцтвам Юлі Кашапавай. Першае заданне - на разуменне матэматыкі. Трэба было падлічыць, колькі торфу з'яўляецца на балоце за 10 гадоў, з чым дзеці разабраліся на раз. Пайшлі далей, не забыўшыся сфатаграфавацца. На кожнай кропцы маршруту неабходна было зрабіць фотапацвярджэнне. Пасля мы разгадвалі назву рэдкай насельніцы балота з птушынага царства — заадно ўзгадвалі англійскую мову. З горам напалам, адолеўшы новыя словы і ўзгадаўшы аповед Таццяны Фадзееўны, пераклалі - вяртлявая чаротаўка. Але гэтыя заданні былі "кветачкамі", "ягадкі" - наперадзе. Напрыклад, імя балотнага бога арганізатары прапанавалі ўбачыць у зашыфраваным лістку, прыклаўшы да яга люстарка. Ар-Вень, А-вень і нарэшце — так, Аржавень!

Галоўным выпрабаваннем для дзевяцікласнікаў стала пытанне, якое можа і не кожны настаўнік адолее. Хаця паспрабуем, гатовы? Назавіце каралеву Вялікага Княства Літоўскага, якая пачала асушаць балоты? Перабраўшы амаль усіх князёў, пачаўшы чамусьці з XVIII і XIX стагоддзяў, у выніку падабраліся да славутага роду Радзівілаў. Аказалася, што

Бона Сфорца, рашучая італьянка, якая атруціла Барбару Радзівіл, прыклала сваю руку і да беларускіх тарфянікаў!

Дадатковае заданне — знайсці ў краме прадукты з "балотнымі" інгрэдыентамі — мы не зрабілі. Затое ў аптэцы стварылі сапраўдны ажыятаж: уявіце чаргу, сярод якой - натоўп дзяцей, што крычаць: "Якія ў вас ёсць таблеткі і сіропы з журавінамі, багуном і чарніцамі?" Трэба было напісаць як мага больш лекаў, бо за кожную назву даваўся дадатковы бал.

Школьнікам прапанавалі таксама павіншаваць мінакоў з днём водна-балотных угоддзяў. Крыху саромеючыся, але ведаючы, што сказаць, дзеці з нашай каманды ашчаслівілі балотнымі паштоўкамі трох чалавек.

Пераможцам у агульным заліку сталя каманда Настассі Галаванавай: дзяўчына ўвесь час заахвочвала сваю каманду "падціснуць" і ў краме, і ў аптэцы... Але прайграўшых не было — усе атрымалі ў падарунак календары, памятныя кепкі ды іншыя прыемныя прэзенты. А галоўнае — запомнілі столькі цікавай інфармацыі, што ў рэшце рэшт самі захацелі пабываць на балоце. Запомніўся гэты дзень таксама і настаўнікам, якія прынялі ўдзел у квэсце і пазваёміліся з цікавымі адукацыйнымі методыкамі.

Увесь дзень, пакуль старшакласнікі бегалі па пунктах маршруту, малодшыя дзеці разам з чараўніцамі "Дзіцячых экамайстэрняў" Лізай Каўцяк і Машай Гулінай рабілі балотных птушак з паперы і кардону.

Сапраўднае экалагічнае свята для юных аматараў прыроды адбылося на "ўра!”

***Кацярына РАДЗЮК***

**Источник:** Родная прырода. — 2015. — №2. — С.4-5.